# ЗВЕРСТВА І ГУМАННАСЦЬ. ВАЙНА НА МЯЖЫ ПРАВА І МАРАЛІ[1]

**Юрген Габэрмас[2]**

### Уступнае інтэрв'ю П. Баркоўскага з Ю. Габэрмасам

**Павел Баркоўскі:** *Шаноўны прафесар Габэрмас, не маглі б Вы ў якасці прадмовы да беларускага перакладу Вашага артыкула даць невялічкі каментарый як адказ на наступныя пытанні. Ці змянілася грунтоўна Вашае стаўленне да тэмы Вайны ў святле войнаў сучаснасці – гібрыднай агрэсіі Расійскай Федэрацыі супраць Украіны і міжнароднага канфлікту ў Сірыі? Ці магчыма іх уважаць за прававыя войны або справядлівыя войны (войны за «ўсталяванне справядлівасці») у тым кантэксце, у якім яны вызначаюць сябе? Як Вы лічыце, ці спраўдзіліся Вашы прагнозы праз амаль 17 год альбо гісторыя пайшла нейкім адрозным шляхам?*

**Юрген Габэрмас:** *Паважаны спадар Баркоўскі, зараз мне бракуе часу, каб я зноў мог уцягнуцца ў дыскусію наконт настолькі разгалінаваных матэрый.*

*На сённяшні дзень мы назіраем адно правалы, ад Лівіі да Украіны і Сірыі (гэта калі змаўчаць наконт сілавой палітыкі ЗША на бліжэйшым Усходзе, у Іраку і Афганістане, якую я насамрэч крытыкаваў у свой час, без сумневу, даволі рэзка). Варта сцвярджаць, што на кароткі час адчыненае акно магчымасцей для Новага Сусветнага парадку, пачатак якога абвясціў стары Буш у 90-я гады, не сталася скарыстаным. Ужо даўно мы абрынуліся ў старую геапалітыку, у той час як нарматыўна распрацаваны праект, які быў распачаты пасля Другой сусветнай вайны разам з заснаваннем ААН, у нашыя дні відавочна спачывае ў труне. Насуперак усім фрагментаваным аналізам «рэалістаў» наконт новых формаў вядзення вайны і насуперак палітолагам, якія зноў даследуюць рух Да і Ад імперый, я прытрымліваюся меркавання наконт існавання ў доўгатэрміновай перспектыве сусветна-гістарычнай тэндэнцыі на рэалізацыю канстытуцыяналізацыі здавён зліўшагася ў электронным і капіталістычным фармаце сусветнага грамадства. Гэтаму няма аніякай разумнай альтэрнатывы, адно апроч старой*

[1] © Jürgen Habermas © Die Zeit. Крыніца: J. Habermas, Bestialität und Humanität. Ein Krieg an der Grenze zwischen Recht und Moral, in: Die Zeit, 29.04.1999. Рэжым доступу: http://www.zeit.de/1999/18/199918.krieg_.xml. Дата доступу: 20.01.2017.

[2] Юрген Габэрмас – нямецкі філасаф і сацыёлаг, якога далучаюць да «трэцяй хвалі» Франкфурцкай школы, з 1994 г. ганаровы прафесар (professor emeritus) Універсітэта Франкфурта-на-Майне.

*і контрпрадуктыўнай літаніі антрапалагічнага песімізму Карла Шміта ды Маргэнтаў. Рэалізм Маргэнтаў і «Баланс страху» ягонага вучня рэкамендаваныя, каб у пажаранебяспечнай сітуацыі пазбегнуць горшага (халодная вайна), але не для паступовага прасоўвання сусветнага грамадства пры дапамозе мадэрнізацыі, што няспынна паскараецца, у час тэхнічнага прагрэсу і – пакуль палітычна неўтаймаванага – росту капіталістычнай вытворчасці. На сённяшні момант падаецца, што мы кіруемся ў цьмяны перыяд нічым не спыняемага разбурэння сеткі выпрацаваных у пакутах правілаў міжнацыянальнага супрацоўніцтва. Мы можам адно спадзявацца, што зноў не будзе патрэбная нейкая вялікая катастрофа (як дзве сусветныя вайны і Халакост), каб захаваць іх.*

*Калі хочаце даведацца, як сфармаваліся мае думкі пасля 89-90-х гг. наконт інстытуцыялізаванай сусветнай нутраной палітыкі, рэкамендую пачытаць маё інтэрв'ю з Міхаэлем Галерам (Michael Haller: J. H., Vergangenheit als Zukunft, 2. Auflage piper München Zürichch 1993). А мае ўяўленні наконт канстытуцыялізаванага сусветнага грамадства, якія я прадумваў яшчэ ў артыкуле пра Косава, я развіў у сваёй кнізе «Да статута Еўропы» («Zur Verfassung Europas» (Suhrkamp 2011)). Але ж на сёння таксама падаецца, што ядро Еўропы (Еўразона, das Kerneuropa), з якога гэтая перспектыва адбудоўваецца, мае знікнуць.*

*15.12.16 © Юрген Габэрмас*

З першым ужываннем Бундэсвэра скончыўся доўгі перыяд, які быў характэрны для грамадскага руху нямецкага пасляваеннага менталітэту. Вайна. Зразумела, «паветраныя ўдары» Альянсу імкнуліся быць чымсьці адрозным ад вайны ў традыцыйным разуменні. Сапраўды, «хірургічная дакладнасць» паветраных налётаў і пакладзеная ў аснову ашчаднасць да цывільных асоб маюць вялікае значэнне для легітымацыі. Гэта значыць аддаленне ад вядзення татальнай вайны, што да твару стагоддзю, якое заканчваецца. Але нават мы, яе напаўўдзельнікі, якім тэлебачанне штовечар прапануе канфлікт у Косава за вячэрай, ведаем, што югаслаўскае насельніцтва, якое хаваецца ад гэтых паветраных налётаў, не разумее іх інакш як вайну.

На шчасце, нямецкай грамадскай прасторы бракуе бляклых тонаў. Ніякай фаталістычнай тугі, ніякай інтэлектуальнай мітусні для добрых камрадаў. Падчас вайны ў Персідскай затоцы яшчэ ўздымалася рыторыка ваеннай неабходнасці, заклёны ў духу дзяржаўнага пафасу, годнасці, трагізму і мужнай сталасці супраць нейкага шумлівага руху за мір. Ад абодвух не засталося больш нічога. Тут і там яшчэ сустракаецца з'едлівасць наконт пацыфізму, што зрабіўся нясмелым, альбо моцны лозунг: «Мы сышлі долу з вышынь маралі». Але гэты голас больш не ўражвае, бо і абаронцы, і супраціўнікі ўжывання сілы карыстаюцца празрыстай нарматыўнай мовай.

## Прававы пацыфізм (legal pacifism)

Прававы пацыфізм імкнецца не толькі абмежаваць міжнародна-прававым шляхам ваенны канфлікт, што схавана прысутнічае паміж дзвюма суверэннымі дзяржавамі, але і ўзняць яго на ўзровень касмапалітычнага парадку легалізацыі. Ад Канта да Кельзэна[3] існуе гэтая традыцыя, і ў нас таксама. Але сёння яна ў першы раз сур'ёзна прынятая нямецкім урадам. Непасрэдны ўдзел у асацыяцыі грамадзян сусвету, здаецца, абараніў бы грамадзяніна дзяржавы ад свавольства ўласнага ўраду. Найважнейшым вынікам права, якое пранікае праз суверэнітэт дзяржавы, як ужо можна было ўбачыць у выпадку з Пінaчэтам, з'яўляецца асабістая адказнасць функцыянераў за злачынствы, што яны здзейснілі падчас дзяржаўнай і ваеннай службы.

У Федэральнай Рэспубліцы на адным баку адкрытай палемікі пануюць пацыфісты па перакананнях, на другім – прадстаўнікі прававога пацыфізму. Нават «рэалісты» прыхаваліся пад мантыяй нарматыўнай рыторыкі. Выказванні pro et contra[4] натуральна спалучаюць супрацьлеглыя матывы. Тыя, хто развaжаюць з пункту гледжання палітыкі сілы, цалкам не давяраючы нарматыўнаму ўтаймаванню суверэннай дзяржаўнай улады, знаходзяцца поплеч з пацыфістамі, у той час як «атлантысты», што зыходзяць з чыстай аданасці Альянсу, заглушаюць свой недавер да ўрадавага энтузіязму наконт правоў чалавека, да людзей, якія яшчэ нядаўна выходзілі на вуліцы супраць размяшчэння «Першынг II». Дрэгер і Бар стаяць побач са Штрэбеле, Шойбле і Руэ – з Эплерам[5].

Карацей кажучы, левыя ва ўрадзе і пераважнасць нарматыўных аргументаў разам утвараюць не толькі дзіўны баявы парадак, але і акалічнасць, што заспакойвае: грамадская дыскусія і меркаванне ў Нямеччыне ніяк не адрозніваюцца ад іншых заходнееўрапейскіх краін. Ніякага іншага шляху, ніякага адрознага разумення. Раней яшчэ адзначаюцца лініі разлому паміж кантынентальнымі еўрапейцамі і англасаксамі, прынамсі паміж гэтымі, якія запрашаюць генеральнага сакратара ААН на свае пасяджэнні і шукаюць нейкага паразумення з Расіяй, і тымі, якія давяраюць галоўным чынам сваёй зброі.

---

3 Ганс Кельзэн (1881–1973) – аўстрыйскі юрыст габрэйскага паходжання, тэарэтык канстытуцыйнага права, заснавальнік і суддзя першага канстытуцыйнага суда.

4 «За і супраць» – лац.

5 Альфрэд Дрэгер (1920–2002) – нямецкі кансерватыўны палітык, прадстаўнік ХДС/ХСС (CDU/CSU); Эган Бар (1922–2015) – нямецкі палітык, прадстаўнік СДП (SPD); Ганс-Хрысціян Штрэбеле (нар. 1939) – нямецкі правазнаўца і палітык, прадстаўнік Саюза 90/Зялёных; Вольфганг Шойбле (нар. 1942) – нямецкі палітык, прадстаўнік ХДС (CDU); Фолькер Руэ (нар. 1942) – нямецкі палітык, прадстаўнік ХДС (CDU); Эрхард Эплер (нар. 1926) – нямецкі палітык, прадстаўнік СДП (SPD).

Натуральна, ЗША і дзяржавы Еўразвязу, якія нясуць палітычную адказнасць, зыходзяць з агульнай пазіцыі. Пасля правалу перамоў у Рамбуе[6] яны ажыццяўляюць пагражальныя ваенныя акцыі пакарання супраць Югаславіі з абвешчанай мэтай: каб дамагчыся ліберальнага ўрэгулявання пытання аўтаноміі Косава ўнутры Сербіі. У межах класічнага міжнароднага права гэта разглядалася б як умяшанне ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы, што значыць парушэнне забароны на інтэрвенцыю. Зыходзячы з перадумоў палітыкі правоў чалавека, гэтае дзеянне вымагае свайго разумення як узброеная, але ўхваленая сусветным грамадствам (нават без маўклівага мандата ААН) місія па забеспячэнні міру. Згодна з гэтай заходняй інтэрпрэтацыяй вайна ў Косава магла б успрымацца як скачок ад класічнага міжнароднага права да касмапалітычнага права сусветнай грамадзянскай супольнасці.

Гэтае развіццё пачалося з утварэннем ААН і пасля стагнацыі падчас канфлікту паміж Усходам і Захадам было паскоранае праз вайну ў Персідскай затоцы, як і праз іншыя інтэрвенцыі. Гуманітарныя ўмяшанні, вядома, з 1945 ажыццяўляліся толькі ад імя ААН і з фармальнай згоды ўраду, які пацярпеў (у той ступені, у якой дзяржаўная ўлада была ў наяўнасці). Падчас вайны ў Персідскай затоцы Савет Бяспекі з увядзеннем беспалётнай зоны над іракскай паветранай прасторай і «зоны бяспекі» для курдскіх уцекачоў у Паўночным Іраку фактычна ўмяшаўся ва «ўнутраныя справы» суверэннай дзяржавы. Але гэта не было яўна звязана з абаронай меншасці, якую пераследавалі, ад уласнага ўраду. У рэзалюцыі 688 ад красавіка 1991 Аб'яднаныя Нацыі спасылаліся на права інтэрвенцыі, якое належыць ім у выпадках «пагрозы для міжнароднай бяспекі». Сёння абставіны іншыя. Паўночнаатлантычны ваенны альянс дзейнічае без мандата Савета Бяспекі, апраўдваючы, аднак, інтэрвенцыю як правамоцную абарону этнічнай (і рэлігійнай) меншасці, якую пераследуюць.

Ад смерці, тэрору і выгнання ў Косава за месяцы перад пачаткам паветраных налётаў пацярпелі ўжо 300 000 асоб. Апрача гэтага, трагічныя вобразы калон выгнанцаў пашырыліся ў кірунку Македоніі, Чарнагорыі і Албаніі як відавочныя доказы запланаванай этнічнай чысткі, якая ажыццяўляецца доўгімі рукамі. Тое, што ўцекачы таксама ўтрымліваюцца ў якасці закладнікаў, не паляпшае справу. Хоць Мілошавіч карыстаецца паветранай вайной НАТА, каб умацаваць сваю заганную практыку перад благім канцом, засмучальныя сцэны з лагераў уцекачоў не могуць перакруціць прычынна-выніковую сувязь. У рэшце рэшт, мэтаю перамоў было спыніць забойчы этнанацыяналізм. Ці маюць ужытак базавыя прынцыпы канвенцыі па генацыдзе 1948 года ў дачыненні да таго, што цяпер адбываецца на зямлі пад купалам паветранай вайны, пытанне спрэчнае. Але гэта мае дачыненне да фактычных абставін, якія ў якасці «злачынстваў

[6] Перамовы ў Рамбуе паміж уладамі Рэспублікі Югаславія і касаўскімі албанцамі ў студзені-сакавіку 1999 г. датычыліся статусу Косава, прайшлі безвынікова.

супраць чалавечнасці» былі ўведзеныя ў міжнароднае права з падставовых прынцыпаў трыбуналаў па ваенных злачынствах у Нюрнбергу і Токіа. З тае пары, як Савет Бяспекі ўважае гэтыя фактычныя абставіны таксама як «пагрозу міру», яны, пры пэўных умовах, апраўдваюць меры прымусу. Але ў гэтым выпадку, без мандата Савета Бяспекі, сілы інтэрвентаў могуць выводзіць паўнамоцтвы для аказання дапамогі толькі зыходзячы з erga omnes[7] абавязваючых прынцыпаў.

Існуе больш крыніц непакою. На працягу апошняга тыдня ўзмацняўся сумнеў наконт разумнасці стратэгіі перамоў, якая не дазваляла ніякай альтэрнатывы, акрамя ўзброенага нападу. Паўстае, аднак, сумнеў у мэтазгоднасці ваеннага ўдару. У час, калі ў югаслаўскім насельніцтве, глыбока ў шэрагах апазіцыі, узрастае згода з упартым курсам Мілошавіча, паўсюль назапашваюцца пагрозлівыя пабочныя наступствы вайны. Памежныя дзяржавы Македонія і Албанія, як і Рэспубліка Чарнагорыя, уцягваюцца з розных падстаў у вір дэстабілізацыі; Расія, якая валодае ядзернай зброяй, у вялікай ступені захоўвае салідарнасць з «братнім народам», урад якога адчувае ціск. Перадусім растуць сумневы ў адпаведнасці ваенных сродкаў. З кожнымі «звязанымі з гэтым стратамі», з кожным цягнікам, які без намеру разбамбаваны на мосце праз Дунай і ляжыць разарваны на глыбіні, з кожным трактарам з албанцамі-ўцекачамі, з кожным сербскім жылым раёнам, з кожнай цывільнай цэллю, якая міжволі стала ахвярай ракетнага абстрэлу, выяўляюцца не нейкія непрадугледжаныя абставіны вайны, але боль, які мае на сваім сумленні «наша» інтэрвенцыя.

Пытанні наконт адпаведнасці цяжкія для адказу. Ці не мусіла б НАТА папярэдзіць на паўгадзіны раней пра знішчэнне дзяржаўнага радыё? Таксама наўмысныя разбурэнні – палымнеючая тытунёвая фабрыка, газавы завод у агні, збамбаваныя шматпавярховікі, вуліцы і брук, руйнаванне эканамічнай інфраструктуры краіны, ужо пацярпелай праз эмбарга ААН – толькі ўзмацняюць непакой. Кожнае дзіця, якое загінула падчас уцёкаў, ірве нашыя нервы. Далей, нягледзячы на відавочную прычынна-выніковую сувязь, ніткі адказнасці цяпер заблытваюцца. У няшчасці выгнання вынікі бязлітаснай палітыкі дзяржаўнага тэрарыста разам з пабочнымі наступствамі ваенных удараў, якія замест таго, каб утаймаваць яго крывавую справу, даюць яму магчымасць для адгаворак, ствараюць клубок, які цяжка разблытаць.

Зрэшты, існуе сумнеў у дачыненні да палітычнай мэты, што зрабілася размаітай. Насамрэч пяць патрабаванняў да Мілошавіча адпавядаюць тым самым беззаганным прынцыпам, згодна з якімі былі састаўленыя пагадненні ў Дэйтане для ліберальным чынам утворанай шматэтнічнай Босніі. Косаўскія албанцы не мелі б права на сэцэсію, калі б толькі былі выкананыя іх патрабаванні аўтаноміі ўнутры Сербіі. Вялікаалбанскі нацыяналізм, які атрымаў пад'ём

[7] «Адносна ўсіх» – лац.

праз адшчапленне, ані на грош не лепшы за вялікасербскі, які інтэрвенцыя мусіць абмежаваць. Тым часам раны этнічнай чысткі робяць з кожным новым днём яшчэ больш непазбежным перагляданне мэтаў раўнапраўнага суіснавання этнічных груп. Але падзел Косава быў бы тым больш сэцэсіяй, якую ніхто не можа пажадаць. Да таго ж устанаўленне пратэктарату патрабавала б змены стратэгіі, а менавіта вайны на зямлі і на дзесяцігоддзі прысутнасці міратворчых узброеных сіл. Калі б мусілі пачацца такія неспадзяваныя наступствы, трэба было б рэтраспектыўна паставіць пытанне аб легітымацыі аперацыі яшчэ раз і цалкам іншым чынам.

У дэкларацыях нашага ўраду прысутнічае відавочна рэзкі тон, празмернасць у сумнеўных гістарычных паралелях, нібы Фішэр і Шарпінг[8] з іх рыторыкай, што б'е, як малаток, мусяць прыглушаць у саміх сабе нейкі іншы голас. Ці існуе страх, што палітычны правал ужывання войска перафарбуе інтэрвенцыю ў нейкі адрозны колер, ці нават, магчыма, адкіне праект рашучага фармавання міждзяржаўных адносінаў на дзесяцігоддзі назад? І потым, ці не застанецца на тле «паліцэйскага ўмяшання», якое НАТА высакародна арганізавала для супольнасці народаў, не проста звычайная вайна, а нават вайна брудная, якая толькі кіне Балканы ў яшчэ большую катастрофу? І хіба гэта не вада на млын таго самага Карла Шміта, які заўсёды ведаў тое лепш: «Хто кажа пра чалавечнасць, ашукае»? Ён прывёў свой антыгуманізм да знакамітай формулы: «Гуманнасць, зверства». Пранізлівы сумнеў, ці не з'яўляецца ўрэшце прававы пацыфізм фальшывым праектам, змяшчаецца ў самай глыбіні крыніц непакою.

## Супярэчнасці рэальнай палітыкі...

Вайна ў Косава закранае прынцыповае і адначасова спрэчнае для паліталогіі і філасофіі пытанне. Дэмакратычная канстытуцыйная дзяржава дасягнула вялікіх цывілізацыйных поспехаў ва ўтаймаванні палітычнай улады на аснове суверэнітэту прызнанага суб'екта міжнароднага права, у той час як стан «сусветнага грамадзянства» гэтую незалежнасць нацыянальнай дзяржавы не прымае ў разлік. Ці не спатыкаецца тут універсалізм Асветніцтва аб упартасць палітычнай улады, якая няўхільна ўпісаная ў цягу да самасцвярджэння паасобнай супольнасці? Гэта калючка рэалізму ў целе палітыкі правоў чалавека.

Таксама рэалістычная школа думкі прымае натуральна ў разлік структурнае зрушэнне ад той сістэмы незалежных дзяржаў, што паходзіць ад Вэстфальскага міру 1648 года: узаемазалежнасці сусветнай супольнасці, якая ўвесь час усё больш ускладняецца; маштаб праблем, якія дзяржавы маглі б вырашыць толькі кааператыўна; узрастаючы аўтарытэт і ўшчыльненне наднацыянальных аргані-

[8] Ёшка Фішар (нар. 1948) – нямецкі палітык, прадстаўнік Саюза 90/Зялёных (Bündnis 90/Die Grünen); Рудольф Шарпінг (нар. 1947) – нямецкі палітык, прадстаўнік СДП (SPD).

зацый, парадак і дзеянні не толькі ў сферы калектыўнай бяспекі; эканамізацыю знешняй палітыкі, сціранне класічных межаў паміж унутранай і знешняй палітыкай увогуле. Але песімістычны вобраз чалавека і своеасаблівае невідавочнае паняцце «палітычнага як такога» вымалёўваюць задні план тае дактрыны, якая больш-менш неабмежавана магла б прытрымлівацца прынцыпу неўмяшальніцтва, уласцівага міжнароднаму праву. На інтэрнацыянальнай памежнай сцяжыне незалежныя нацыянальныя дзяржавы мусяць мець магчымасць рухацца па меры ўласных інтарэсаў адпаведна ўласнаму меркаванню і, калі магчыма, бесперашкодна, таму што бяспека і выжыванне калектыву ёсць з пункту гледжання яго ўдзельнікаў непарушнымі каштоўнасцямі і таму што з перспектывы вонкавага назіральніка імператывы мэтарацыянальнага самасцвярджэння заўсёды лепш за ўсё рэгулююць адносіны паміж калектыўнымі актарамі.

З гэтага пункту гледжання схільная да інтэрвенцыі палітыка правоў чалавека робіць адну катэгарыяльную памылку. Яна недаацэньвае і пэўным чынам дыскрымінуе «натуральную» тэндэнцыю да самасцвярджэння. Яна хоча накінуць нарматыўныя крытэрыі на патэнцыял улады, што пазбягае стандартызацыі. Карл Шміт абвастрыў бы гэтую аргументацыю яшчэ больш праз сваё своеасабліва стылізаванае «вызначэнне сутнасці» палітычнага. Разам са спробай «маралізавання» на тэму нейтральнага з самага пачатку абгрунтавання паняцця дзяржавы, як ён лічыў, палітыка правоў чалавека найперш сама прымушае прыродную барацьбу нацый дэгенераваць да жахлівай «барацьбы са злом».

Насуперак гэтаму паўстае важкае пярэчанне. Гэта не так, што ў постнацыянальным суплёце энергічныя нацыянальныя дзяржавы будуць, нібыта марыянеткі, кіравацца праз ніткі правілаў супольнасці народаў. Наадварот, існуе эрозія дзяржаўнага аўтарытарызму, грамадзянскія войны і ўнутраныя этнічныя канфлікты дзяржавы, што распадаецца і мацуецца аўтарытарна, якія запланавана выклікаюць інтэрвенцыі, не толькі ў Самалі і Руандзе, але і ў Босніі, і цяпер у Косава. Таксама не знаходзіць сілкавання падазрэнне з боку крытыкі ідэалогіі. Дадзены выпадак паказвае, што ўніверсальныя апраўданні ні ў якім разе і ніколі не хаваюць адасобленасць непрызнаных інтарэсаў. Тое, што герменеўтыка падазрэння можа прад'явіць наконт нападу на Югаславію, даволі нязначнае. Для палітыкаў, якім глабальная эканоміка дазваляе мець адно малую ўнутрыпалітычную прастору для гульняў, знешнепалітычная магчымасць пакрасавацца дае нават нейкі шанс. Аднак ані матыў бяспекі і пашырэння сферы ўплыву, які прыпісваецца ЗША, ані матыў пошуку ролі, які прыпісаны НАТА, ані матыў «крэпасць Еўропа», які прыпісаны прэвентыўнай абароне ад хваляў мігрантаў, не тлумачаць рашэння на правядзенне настолькі цяжкай, рызыкоўнай і дарагой аперацыі.

Зрэшты, дакор наконт маралізавання палітыкі палягае на няяснасці паняцця. Далей, пажаданае заснаванне стану сусветнага грамадзянства значыла б, што парушэнні супраць правоў чалавека

непасрэдна асуджаюцца і з імі змагаюцца не з пункту гледжання маралі, але як з крымінальным дзеяннем унутры дзяржаўнага правапарадку. Рашучае фармаванне міжнародных прававых адносінаў з'яўляецца немагчымым без падставовых дзеянняў па вырашэнні канфліктаў. Менавіта інстытуцыялізаванне падобнага спосабу дзеянняў абароніць юрыдычна зацверджаны падыход да парушэнняў правоў чалавека ад маральнай індыферэнтнасці права і перашкодзіць маральнай дыскрымінацыі «праціўнікаў», што непасрэдна прасочваецца.

Такое становішча не дасягаецца таксама без манаполіі на ўладу з боку сусветнай дзяржавы і без сусветнага ўраду. Але патрэбны як найменш дзеяздольны Савет Бяспекі, дзейная юрысдыкцыя інтэрнацыянальнага крымінальнага суду і ў дапаўненне Генеральная Асамблея прадстаўнікоў урадаў як «другі ўзровень» рэпрэзентацыі сусветнай супольнасці. Паколькі такая рэформа Аб'яднаных Нацый яшчэ не адчуваецца на дотык, застаецца толькі паказаць на розніцу паміж прававым замацаваннем і маралізаваннем, пярэчанне, па праўдзе, правільнае, але двухбакова небяспечнае. Потым, да тае пары, пакуль правы чалавека на глабальным узроўні параўнальна слаба інстытуцыялізаваныя, можа сцірацца мяжа паміж правам і мараллю, як у дадзеным выпадку. Калі Савет Бяспекі заблакаваны, НАТА можа спасылацца толькі на маральнае значэнне міжнароднага права, настойваць на нормах на карысць неэфектыўных, прызнаных міжнароднай супольнасцю інстанцый ужывання і ажыццяўлення права.

Недастатковасць інстытуцыялізацыі правоў сусветнага грамадзянства праяўляецца, да прыкладу, у дыспрапорцыі паміж легітымнасцю і эфектыўнасцю інтэрвенцый па захаванні і забеспячэнню замірэння. Срэбраніца была абвешчана ААН як зона бяспекі, але падраздзяленні, якія былі там размешчаныя легітымна, не змаглі прадухіліць жудасную масакру пасля ўваходу туды сербаў. У адрозненне ад гэтага, НАТА можа толькі тады эфектыўна супрацьстаяць югаслаўскаму ўраду, калі яна дзейнічае без легітымацыі, у якой ёй адмовіў Савет Бяспекі.

## ...І дылема палітыкі правоў чалавека

Палітыка правоў чалавека імкнецца да таго, каб закрыць дыспрапорцыю паміж гэтымі сіметрычнымі сітуацыямі. Аднак з прычыны недахопу інстытуцыянальнасці правоў сусветнага грамадзянства яна шматразова была прымушаная адно апераджаць будучы касмапалітычны стан, які яна адначасова прагне паскорыць. Як можна пры такой парадаксальнай умове праводзіць палітыку, якая павінна забяспечыць правы чалавека, у выпадку скрайняй неабходнасці, з дапамогай сувымернай ваеннай сілы? Таксама пытанне ўзнікае тады, калі немагчыма ўмяшацца дзе заўгодна: ані ў дачыненні курдаў, ані датычна чачэнцаў альбо тыбетцаў, і найменш ля ўласнага ганку, на раздзярбаных Балканах. Цікавае адрозненне вызначаецца

ў разуменні палітыкі правоў чалавека паміж амерыканцамі і еўрапейцамі. ЗША праводзяць глабальнае ўкараненне правоў чалавека ў якасці нацыянальнай місіі вялікай дзяржавы, прытрымліваючыся гэтай мэты ў якасці перадумоваў палітыкі гвалту. Большасць урадаў Еўразвязу разумеюць пад палітыкай правоў чалавека хутчэй нейкі праект радыкальнага прававога фармавання міжнацыянальных адносінаў, што ўжо сёння мяняе параметры палітыкі гвалту.

ЗША ў слаба рэгламентаваным праз ААН свеце дзяржаў прынялі задачу супердзяржавы па навядзенні парадку. Пры гэтым правы чалавека выкарыстоўваюцца для ацэнкі палітычных мэтаў як маральныя каштоўнасныя арыентацыі. Заўжды існуюць і супрацьлеглыя плыні ізаляцыяніcцкага кшталту, і, гэтаксама як астатнія нацыі, ЗША дбаюць у першую чаргу аб уласных інтарэсах, якія не заўсёды адпавядаюць заяўленым нарматыўным мэтам. Гэта выявіла вайна ў В'етнаме, ізноў і заўсёды выяўляе стаўленне да праблемаў на іх уласным «заднім двары». Але ў Злучаных Штатах мае традыцыю «новая змяшаная форма гуманітарнага альтруізму і імперская логіка сілы» (Ульрых Бэк). У падмурку матываў уступіць у Першую сусветную вайну за часамі Уілсана, у Другую – за часамі Рузвельта была таксама менавіта арыентацыя на ідэалы, якія глыбока ўкараніліся ў прагматычнай традыцыі. Гэтаму абавязаны і мы, пераможаная ў 1945-м нацыя, бо адначасова мы былі вызваленыя. Зыходзячы з гэтага вельмі амерыканскага і гэтаксама нацыянальнага пункту гледжання нарматыўна арыентаванай палітыкі гвалту з неабходнасцю, здаецца пераканаўчым сёння, нягледзячы на ўсе складанасці, працягваць барацьбу супраць Югаславіі адкрыта і бескампрамісна, пры неабходнасці з ужываннем наземных атрадаў. Усё ж такі гэта мае перавагу паслядоўнасці. Але што мы скажам, калі аднойчы ваенны хаўрус нейкага іншага рэгіёна – скажам, у Азіі – зоймецца ўзброенай палітыкай правоў чалавека, якая палягае на цалкам іншых, толькі яму ўласцівых інтэрпрэтацыях міжнароднага права альбо Хартыі ААН?

Справа выглядае інакш, калі правы чалавека ўступаюць у гульню не толькі як маральная арыентацыя ўласных палітычных дзеянняў, але як правы, якія мусяць быць рэалізаваныя ў юрыдычным сэнсе. Менавіта правы чалавека паказваюць, нягледзячы на іх чысты маральны змест, на структурныя рысы асабістых правоў, якія з самага пачатку не маюць іншай магчымасці, як толькі дамагчыся станоўчага замацавання іх законнае сілы ў сістэме змушаючага Права. Толькі калі правы чалавека знойдуць падобным чынам сваю «рэзідэнцыю» ў пашыранай на ўвесь свет дэмакратычнай сістэме права ў якасці падставовых правоў нашых нацыянальных канстытуцый, мы будзем таксама мець дазвол выйсці на глабальны ўзровень, таму што адрасаты гэтых правоў змогуць адначасова разумець сябе ў якасці іх аўтараў.

Установы ААН знаходзяцца на шляху, каб замкнуць кола паміж пільна патрэбным ужыццём змушаючага права і дэмакратычнай прававой сістэмай. А дзе гэта не выпадае, застаюцца нормы, і няхай

яны будуць не толькі тым, што мае маральны змест, але і прымусова ўскладзенымі абмежаваннямі. Сапраўды, у Косава дзяржавы-інтэрвенты спрабуюць насадзіць патрабаванні дзеля тых, чые правы чалавека зневажаюцца ўласным урадам. Але і сербы танчаць на вуліцах Бялграда, як вызначыў Славой Жыжэк, «не чакаючы ніякіх пераапранутых амерыканцаў, а каб пазбавіцца праклёну нацыяналізму». Палітычны парадак, які гарантуе ўсім грамадзянам роўныя правы, навязаны ім сілай зброі. Гэта таксама мае сэнс з нарматыўнага пункту гледжання да тае пары, пакуль хаця б ААН не ўжыла супраць свайго члена, Югаславіі, ваенныя санкцыі.

Нават 19 бясспрэчна дэмакратычных дзяржаў, якія далі сабе права ўмяшацца, застаюцца адно партыяй. Яны валодаюць кампетэнцыямі інтэрпрэтацыі і прыняцця рашэнняў, якія пасуюць – калі ўжо сёння так павялося ў прававых справах – толькі незалежным інстытуцыям; паколькі дзейнічаюць яны па-патэрналісцку. Спрыяе і добры маральны падмурак. Але той, хто дзейнічае, усведамляючы непазбежнасць часовага патэрналізму, таксама ведае, што ўлада, якую ён ажыццяўляе, яшчэ не валодае якасцю прававой непазбежнасці, што мае легітымацыю ў рамках дэмакратычнай сусветнай супольнасці. Маральныя нормы, якія апелююць да нашага лепшага разумення, не могуць быць вынікам прымусу ў якасці ўстаноўленых нормаў права.

## Ад палітыкі гвалту да сусветнай грамадзянскай супольнасці

З той дылемы, што дзейнічаць трэба так, нібыта ўжо існуе інстытуцыялізаваны стан сусветнага грамадзянства, які ёсць прага ўмацоўваць, не вынікае ўсё ж нейкай максімы, што трэба пакінуць ахвяр іхнім катам. Тэрарыстычнае злоўжыванне дзяржаўнай уладайператварае класічную грамадзянскую вайну ў масавае злачынства. Калі не атрымліваецца інакш, дэмакратычныя суседзі мусяць мець магчымасць памкнуцца з тэрміновай дапамогай, легітымаванай міжнародным правам. Але менавіта тады незавершанасць стану сусветнага грамадзянства патрабуе асаблівай чуллівасці. Ужо існуючыя інстытуцыі ды акты – гэта адзіны наяўны сродак кантролю абвінаваўчых прысудаў партыі, якая хоча дзейнічаць ад імя цэлага.

Крыніцай непаразуменняў, да прыкладу, з’яўляецца розначасовасць палітычных менталітэтаў, якія сутыкаюцца адзін з адным. Паміж вайной НАТА ў паветры і вайной сербаў на зямлі месцяцца, праўда без розніцы ў часе, 400 гадоў, як мяркуе Энцэнсбэргер[9]. Наконт вялікасербскага нацыяналізму мне прыходзіць да галавы

[9] Ганс Магнус Энцэнсбэргер (нар. 1929) – нямецкі паэт, пісьменнік, грамадскі дзеяч (зац. перакл.).

хутчэй Эрнст-Морыц Арнт[10], чымся Грымельсгаўзэн[11]. Але палітолагі канстатавалі, што паміж «першым» і «другім» светам склалася розніца ў нейкай новай свядомасці. Толькі міралюбныя, заможныя супольнасці АЭСР[12] могуць дазволіць сабе прывесці да больш-меншай гармоніі свае нацыянальныя інтарэсы з узроўнем патрабаванняў напалову сусветнаграмадзянскай ААН.

Насуперак гэтаму «другі свет» (у новым прачытанні) выступіў як спадчыннік палітыкі гвалту еўрапейскага нацыяналізму. Такія дзяржавы, як Лівія, Ірак альбо Сербія, згладжваюць свае нестабільныя ўнутраныя адносіны праз аўтарытарнае панаванне і палітыку ідэнтыфікацыі; калі яны стрымліваюць сябе ў экспансіі вонкі, яны чуллівыя да памежных пытанняў і неўратычна фанабэрацца сваім суверэнітэтам. Назіранні за гэтай манерай падвышаюць псіхалагічны бар’ер для камунікацыі з іншымі. Сёння яны апраўдваюць патрабаванні да больш моцных дыпламатычных высілкаў.

Адна справа, калі ЗША, працягваючы, як заўсёды, знакамітую палітычную традыцыю, граюць ролю гегемона і гаранта парадку праз інструменты правоў чалавека. Іншая справа, калі мы разумеем небяспечны пераход ад класічнай палітыкі гвалту да становішча сусветнага грамадзянства ў часе пахавання актуальнага, таксама вырашальнага з дапамогай зброі канфлікту як агулам патрабуючы пераадолення працэс навучання. Далейшая спасцігальная перспектыва таксама заклікае нас да асцярожнасці. Паўнамоцтвы, якія НАТА дазволіла сама сабе, не могуць ператварыцца ў звычайны стан рэчаў.

*Пераклад з нямецкай Змітра Мінкевіча*

---

10 Эрнст-Морыц Арнт (1769-1860) – нямецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч (зац. перакл.).

11 Ганс Якаб Крыстофэль фон Грымельсгаўзэн (1622-1676) – выбітны нямецкі пісьменнік (зац. перакл.).

12 АЭСР (OECD) – Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (зац. перакл.).